ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 21 (543) | Субота, 11 чэрвеня 1983 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## У ПАРТКОМЕ

На чарговым пасяджэнні партыйнага камітэта універсітэта, якое адбылося ў мінулую сераду, абмеркавана пытанне «Аб рабоце камітэта камсамола па павышэнню адказнасці камсамольцаў за выкананне Статута ВЛКСМ». З дакладам выступіў сакратар камітэта ЛКСМБ С. У. Аўсеенка. У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел старшыня студэнцкага прафкома Н. І. Колтышава, намеснік сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце У. М. Калмыкоў, старшыня камісіі пры парткоме па кантролю за якасцю вучэбнага працэсу Ф. М. Харытановіч, дэкан эканамічнага факультэта У. Д. Арэшчанка, іншыя члены парткома. Выказаныя на пасяджэнні думкі па абмяркаванаму пытанню падвёў сакратар парткома М. І. Старавойтаў, пасля чаго была прынята адпаведная пастанова.

Партыйны камітэт зацвердзіў групу камандзіраў і камісараў студэнцкіх атрадаў, разгледзеў кадравыя і некаторыя іншыя пытанні.

## СУВЯЗЬ З ПРАКТЫКАЙ ЖЫЦЦЯ

### ДА ВЫНІКАЎ НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА У СІСТЭМЕ ПАЛІТАСВЕТЫ

У прайшоўшым навучальным годзе ў сістэме палітасветы ў нашым універсітэце выкарыстоўваўся вопыт МДУ імя М. В. Ламаносава і іншых вядучых ВНУ краіны. Першыя заняткі праводзіліся ў актавай зале для ўсіх слухачоў і прапагандыстаў. На іх выступілі з лекцыямі: намеснік сакратара парткома, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Я. А. Семянчук па тэме «Саюз непарушны рэспублік свабодных», а таксама загадчык кафедры навуковага камунізму, дацэнт У. І. Качаткоў і аўтар гэтых радкоў.

Адной з форм павышэння метадалагічнай, метадычнай і палітычнай кваліфікацыі з'яўляецца правядзенне канферэнцый. Так, у лістападзе 1983 г. адбылася агульнауніверсітэцкая канферэнцыя, прысвечаная 60-годдзю выхаду ў свет працы У. І. Леніна «Аб значэнні ваяўнічага матэрыялізму». З дакладамі выступілі кандыдаты філасофскіх навук В. Я. Яцук, дацэнт Я. В. Яршоў-Мазураў з кафедры філасофіі, сакратар партбюро біялагічнага факультэта дацэнт В. А. Хількевіч, дацэнты А. М. Качамін з фізічнага і сакратар партбюро Л. Я. Палякоў з матэматычнага факультэтаў і інш.

У красавіку бягучага года на біяфаку адбылася традыцыйная, чацвёртая па ліку, канферэнцыя, на якой ішла размова аб фарміраванні дыялектыка-матэрыялістычнага светапогляду студэнтаў у працэсе выкладання біялагічных і хімічных дысцыплін. У яе правядзенні ўдзельнічала і кафедра філасофіі.

У папярэднім месяцы многія выкладчыкі нашага універсітэта прынялі ўдзел у міжвузаўскай канферэнцыі «Фарміраванне навуковага светапогляду студэнтаў у вучэбным працэсе», якая праходзіла ў БІІЧТу. Прадстаўнікі ГДУ зрабілі на ёй 16 дакладаў па грамадскіх і гуманітарнвх і 14 — па прыродазнаўчых навуках.

На пленарным пасяджэнні гэтай канферэнцыі з цікавымі дакладамі выступілі рэктар нашага універсітэта акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць і загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі член-карэспандэнт АПН СССР І. Ф. Харламаў.

Большасць з прадстаўленых на канферэнцыях дакладаў прайшлі апрабацыю на метадалагічных семінарах. Такім чынам ажыццяўлялася сувязь палітычнай вучобы з практыкай, г. зн. навукова-даследчай і вучэбна-метадычнай работай.

На ўсіх метадычных семінарах кафедр грамадскіх навук былі абмеркаваны тэарэтычныя даклады, прысвечаныя юбілею К. Маркса. Да 165-годдзя з дня яго нараджэння былі афармлены спецыяльныя стэнды. Такім чынам, у адзінае цэлае ўвязваліся вучэбная, палітыка-выхаваўчая работа і палітычная вучоба.

Па ўсіх формах палітасветы шмат увагі ўдзялялася вывучэнню партыйных дакументаў, матэрыялаў майскага (1982 г.) і лістападаўскага (1982 г.) Пленумаў ЦК КПСС, урачыстага сходу ў Маскве, прысвечанага 60-годдзю ўтварэння СССР.

У рабоце кожнага семінара або школы адзначаліся станоўчыя бакі, мелі месца і недахопы. На дастаткова высокім тэарэтычным узроўні праходзілі заняткі на геалагічным факультэце ў метадалагічным семінары, якім кіруе вопытны, эрудзіраваны прапагандыст дацэнт кафедры філасофіі Д. Г. Процкая. Лепшыя рэфераты, абмеркаваныя на семінары, М. А. Жураўля «Размеркавальныя адносіны ва ўмовах развітога сацыялізму», Л. Д. Мядзведзева «Сацыяльна-філасофскія аспекты свету» атрымалі высокую ацэнку.

Па ўсіх формах палітычнай вучобы адбыліся падагульняючыя заняткі і канферэнцыі. Яны яшчэ раз засведчылі нашы поспехі ў павышэнні палітычнай адукацыі і выявілі недапрацоўкі.

Закончыўся навучальны год і ў філіяле універсітэта марксізму-ленінізму пры абкоме КПБ. Большасць слухачоў грунтоўна засвоіла пройдзеную праграму і паказала глыбокія веды на экзаменах. Разам з тым нельга не сказаць, што асобныя слухачы несур'ёзна адносіліся да павышэння сваёй палітычнай падрыхтоўкі, прапускалі заняткі і засталіся неатэставанымі. Тых, каго гэта датычыцца, трэба з належнай патрабавальнасцю спытаць на пасяджэннях партыйных бюро, каб у будучым падобнае не паўтаралася.

На факультэтах, кафедрах і ў іншых універсітэцкіх падраздзяленнях неабходна дэталёва прадумаць камплектацыю ўсіх звенняў партыйнай вучобы на наступны навучальны год з тым, каб узняць яе на якасна новы ўзровень, павысіць эфектыўнасць.

**У. КАЛМЫКОЎ,**
**намеснік сакратара парткома на ідэалагічнай рабоце, прафесар.**

## ЧАС НАДЗЕЙ І ХВАЛЯВАННЯЎ

Дзённік сесіі

### АПОШНІ ЭКЗАМЕН

У аўдыторыі — ўрачыстая атмасфера, на стале, за якім члены экзаменацыйнай камісіі — шмат кветак. І самі вінаўнікі ўрачыстасці выглядаюць сур'ёзнымі, пасталеўшымі, таму што добра ўсведамляюць і адчуваюць, якая цяпер ускладзена на іх адказнасць. Яны — выпускнікі і трымаюць свой апошні ў студэнцкім жыцці экзамен — дзяржаўны экзамен па навуковаму камунізму. З надзеяй і хваляваннем глядзяць на пяцікурснікаў выкладчыкі, якія былі побач са студэнтамі на працягу ўсіх гадоў іх вучобы, давалі ім трывалыя веды, рыхтавалі для краіны новы атрад маладых высокакваліфікаваных спецыялістаў. І вось настаў час праверыць плён сваёй карпатлівай працы.

Дзяржаўны экзамен — гэта праверка пяцікурснікаў не толькі на веды, але і на грамадзянскую сталасць, на іх гатоўнасць уступіць у самастойнае жыццё. Гэта разумее кожны юнак і дзяўчына, таму падрыхтоўка да апошняга выпрабавання была ў іх самай сур'ёзнай. Адсюль і вынікі: пераважная колькасць выдатных і добрых адзнак.

З поспехам вытрымалі дзяржаўны экзамен пяцікурснікі спецыяльнасці руская мова і літаратура, беларуская і руская мова і літаратура. Сваімі выдатнымі адказамі на экзамене пацвердзілі права называцца лепшымі выпускнікамі ГДУ 1983 года студэнткі гістфіла Алена Казанцава, Ірына Чорная, Ала Зайцава, Таццяна Палявая, Ірына Пагонышава, Лідзія Сечка, Люцыя Счастная, Зоя Бурштын і іншыя.

Дзяржаўны экзамен па навуковаму камунізму трымаюць таксама студэнты іншых факультэтаў універсітэта, завочнікі і вячэрнікі.



Упэўненым быў адказ студэнткі групы Р-21 гісторыка-філалагічнага факультэта Таццяны Варабей на экзамене па дыялектычнаму матэрыялізму. Дацэнт кафедры філасофіі Д. Г. Процкая ацаніла яе веды вышэйшым балам.

Фота К. Дзмітэркі.

## ДОБРЫ СТАРТ БІЁЛАГАЎ

Набірае тэмпы экзаменацыйная сесія на біяфаку. Чацвёртакурснікі, якія адправіліся на вучэбную практыку, перадалі экзаменацыйную эстафету студэнтам першага—трэцяга курсаў.

На гэтым тыдні здавалі экзамены па фізіцы і заалогіі першакурснікі. Аб чым яны засведчылі? У цэлым, экзаменатары А. А. Савёнак і дацэнт І. П. Арабіна станоўча ацанілі веды студэнтаў па гэтых дысцыплінах.

Дацэнт кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін Д. В. Нікалаева прымала экзамен па цыталогіі ў другакурснікаў. У экзаменацыйнай ведамасці пераважаюць выдатныя і добрыя адзнакі.

Па заалогіі ацаніў веды студэнтаў 2-га курса загадчык кафедры заалогіі і аховы прыроды прафесар Б. П. Савіцкі. Не зусім грунтоўна падрыхтаваліся да гэтага экзамена многія студэнты, у іх залікоўках з'явіліся здавальняючыя адзнакі.

На «выдатна» вытрымалі два названыя экзамены Г. Злотнікава, З. Купо і інш.

Трэцякурснікі здалі экзамен па фізіялогіі раслін. Яго прымаў загадчык кафедры батанікі і фізіялогіі раслін, прафесар Ф. М. Харытановіч. Ён ацаніў веды студэнтаў, у асноўным, на «выдатна» і «добра». Пяцёркі атрымалі студэнты адной з лепшых акадэмічных груп універсітэта Б-32 С. Парошын, С. Рыдны, Г. Барскіх, А. Нікаленка, М. Цімашкова.

## БЕЗ СПАДЗЯВАННЯЎ НА СЧАСЛІВУЮ ВЫПАДКОВАСЦЬ

На матэматычным факультэце экзамены пачынаюцца пазней, чым у астатніх студэнтаў ГДУ. Тут толькі закончылі здачу залікаў. Але ўжо можна зрабіць пэўныя вывады і «прыкінуць», як будуць праходзіць экзамены. Варта паўтарыць старую ісціну: стаpанны студэнт аднолькава адносіцца да ўсіх вывучаемых дысцыплін, незалежна ад таго, што атрымае ён: адзнаку ў залікоўцы ці проста «залік».

У асноўным будучыя матэматыкі падышлі да экзаменаў без запазычанасцей. Гэта тыя студэнты, хто рэгулярна наведваў заняткі, своечасова рыхтаваў курсавыя і практычныя работы. Аднак сустракаюцца яшчэ і такія, для каго вучоба не стала першачарговай задачай, і залікова-экзаменацыйная сесія для іх — сапраўднае «стыхійнае бедства». Сярод іх — другакурснік С. Лук'янаў, у якога яшчэ з зімовай сесіі засталіся «хвасты», першакурснікі С. Кузьмянчук і Т. Тапарова. Яна, напрыклад, не атрымала залікі па трох дысцыплінах: алгебры, замежнай мове і нават фізічнаму выхаванню. У тым, што такія студэнты ёсць на факультэце, бачаць сваю непасрэдную віну выкладчыцкі калектыў матфака: значыць, дзесьці не дапрацавалі з адстаючымі. Цяпер для іх наладжваюцца кансультацыі па найбольш складаных прадметах: штодзённа на кафедрах адстаючы студэнт можа знайсці патрэбнага яму выкладчыка і атрымаць адказы на ўсе цікавячыя яго пытанні.

Настрой у выкладчыкаў, якія будуць прымаць экзамены, можна сказаць, аптымістычны, — зазначыў намеснік дэкана факультэта дацэнт М. В. Селькін. — Яны спадзяюцца пачуць ад студэнтаў грунтоўныя адказы на экзаменах. А галоўнае ў тым, што самі студэнты разумеюць: трэба разлічваць на сваю падрыхтаванасць, а не на шчаслівую выпадковасць.

**Т. ДУБЯК.**

## ВІНШУЕМ!

**Калектыў кафедры галіновых эканомік віншуе аспірантку СЕЛЬКІНУ Людмілу Антонаўну (навуковы кіраўнік — прафесар С. А. Кім) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата эканамічных навук.**

# ВАЖНАЯ ЗАДАЧА — ПАВЫШЭННЕ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ НДР

Выконваючы рашэнні XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда КПБ, пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР (1978 г.) аб павышэнні эфектыўнасці навуковых даследаванняў у вышэйшай школе, XIX Пленума ЦК КПБ (1979 г.) аб павышэнні ўзроўню даследчай работы, калектыў навуковых і навукова-педагагічных супрацоўнікаў ГДУ дабіўся ў мінулым годзе пэўных поспехаў у справе больш поўнай рэалізацыі навуковага патэнцыялу, канцэнтрацыі намаганняў на рашэнне найбольш важных навукова-тэхнічных, сацыяльных і эканамічных праблем, укаранення вынікаў НДР у практыку.

Па выніках навуковай дзейнасці ў 1982 годзе універсітэт заняў 5-е месца сярод 13 ВНУ міністэрства (універсітэты, эканамічныя і тэхнічныя ВНУ). Навуковая работа ацэньвалася па 9 групах паказчыкаў, аб'яднаных па пэўнай прыкмеце: характар НДР (паказчыкі важнасці тэматыкі); планаванне НДР (паказчыкі па аб'ёму НДР, удзелу прафесарска-выкладчыцкага саставу, інжынерна-тэхнічных работнікаў у выкананні бюджэтнай і дагаворнай тэматыкі); укараненне вынікаў НДР (паказчыкі па эканамічнаму эфекту, укараненню ў вытворчасць і вучэбны працэс бюджэтных і дагаворных работ) і г. д.

Аналіз вынікаў навуковай дзейнасці ВНУ міністэрства паказвае, што па некаторых паказчыках наш універсітэт займае адно з вядучых месц сярод ВНУ, асобныя паказчыкі перавышаюць сярэднія па міністэрству. Так, па ўдзельнай вазе важнейшай тэматыкі ГДУ займае 3-е месца (78,0) пасля МРТІ (85,0), БПІ (79,4), у сярэднім па міністэрству гэты паказчык — 72,3, у БДУ — 77,7. Па ўдзельнай вазе работ, выкананых па праграмах розных узроўняў, наш універсітэт на пятым месцы. Сярэднегадавы кошт адной дагаворнай работы ва універсітэце — 44,4 тыс. руб., што значна вышэй сярэдняй па міністэрству, але ніжэй, чым у БДУ. Сярэдні кошт аднаго дагавора ў ГДУ — 163,9 тыс. руб., амаль у два разы вышэйшы сярэдняга па міністэрству (96,1 тыс. руб.).

Па абароне доктарскіх дысертацый універсітэт выйшаў на трэцяе месца (абаронена адна доктарская дысертацыя, або 0,5 на 100 кандыдатаў навук), у БТІ — 0,6, БДУ — 0,55, у сярэднім па міністэрству —0,3.

Прыемна адзначыць, што універсітэт за ўдзел у ВДНГ СССР упершыню ўзнагароджаны двума медалямі (бронзавым і сярэбраным) і па гэтаму паказчыку заняў пятае месца сярод ВНУ. Аўтары адзначаных работ — загадчык кафедры ТСАЭІ дацэнт А. І. Іванюк і дацэнт гэтай жа кафедры У. С. Давыдаў.

Па колькасці завершаных НДР, укаранёных у вытворчасць, наш універсітэт заняў 6-е месца, адносны паказчык (да агульнай колькасці завершаных НДР) склаў 1,53, у БДУ — 1,25, у сярэднім па міністэрству — 1,4.

Але па многіх важнейшых паказчыках універсітэт значна адстае ад сярэдняга ўзроўню па міністэрству і ад вядучых ВНУ, у тым ліку БДУ імя У. І. Леніна.

Не вырашаны яшчэ многія праблемы развіцця і арганізацыі універсітэцкай навукі, у рабоце асобных кафедр і факультэтаў ёсць шмат недахопаў, якія неабходна ўхіліць як мага хутчэй. Па-ранейшаму кафедры геалагічнага, гісторыка-філалагічнага факультэтаў, факультэта фізічнага выхавання (акрамя кафедры фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны), кафедры педагогікі і псіхалогіі, палітэканоміі, гісторыі КПСС не ўдзельнічаюць у распрацоўцы праблем, прадугледжаных дзяржаўнымі планамі эканамічнага і сацыяльнага развіцця рэспублікі і краіны. У выніку універсітэт па такому паказчыку, як тэматыка, якая выконваецца па пастановах урада, заняў толькі 8 месца сярод ВНУ.

Ніжэй сярэдняга па міністэрству (10,6) і такі паказчык, як колькасць навукова-педагагічных і інжынерна-тэхнічных работнікаў — выканаўцаў адной бюджэтнай навукова-даследчай работы. Асабліва нізкі ўзровень камплексавання тэматыкі на фізічным, геалагічным, матэматычным і эканамічным факультэтах.

Па ўдзелу прафесарска-выкладчыцкага саставу ў выкананні дагаворнай тэматыкі ГДУ заняў 11 месца (23,58 на 100 чалавек прафесарска-выкладчыцкага саставу), што значна ніжэй сярэдняга па міністэрству (44,9), БДУ (36,53). Самы высокі навуковы патэнцыял на біялагічным, геалагічным і эканамічным факультэтах. Гэта значыць, звыш 50 прац. выкладчыкаў маюць вучоныя ступені дактароў і кандыдатаў навук. Але выкарыстоўваецца ён для правядзення дагаворных НДР недастаткова. На працягу двух гадоў аб'ём дагаворных НДР на геалагічным, эканамічным, біялагічным факультэтах застаецца нязменным і не перавышае адпаведна 115, 77 і 24 тысячы рублёў. Акрамя гэтага, у бягучым годзе на эканамічным факультэце застаюцца недавыкарыстанымі выдзеленыя фонд зарплаты і колькасць штатных супрацоўнікаў НДС.

Недастаткова прыцягваюцца да работы ў навуковых падраздзяленнях (праблемная і галіновыя навукова-даследчая лабараторыі) выкладчыкі геалагічнага, матэматычнага, біялагічнага (кафедра хіміі) факультэтаў. Універсітэт па ўдзелу прафесарска-выкладчыцкага саставу ў рабоце навуковых падраздзяленняў займае 8 месца. Калі ў сярэднім па міністэрству гэты паказчык (у адносінах да агульнай колькасці прафесарска-выкладчыцкага саставу) — 50,2, у БДУ імя У. І. Леніна — 51,1, то ў ГДУ — 26,1.

На фізічным і геалагічным факультэтах слаба вядзецца работа па дадатковаму фінансаванню галіновых лабараторый па фонду зарплаты і ў выніку ў ГДУ гэты паказчык складае 0, у БДУ — 9,6, у сярэднім па ВНУ — 5,6 (паказчык разлічваецца на 100 чалавек штатнай колькасці навуковых устаноў).

Значна ніжэй сярэдняга паказчыкі эфектыўнасці навуковай дзейнасці універсітэта. Калі па агульнаму аб'ёму выданняў мы займаем 4-е месца (62,5 друкаваных аркушаў), што некалькі ніжэй сярэдняга (67,0 д. а.) і намнога ніжэй, чым у БДУ (115,3 д. а.), і лепшым можна назваць гісторыка-філалагічны факультэт (32 прац. агульнага аб'ёма публікацый), то па колькасці манаграфій на 100 чалавек штатнай колькасці навуковых і навукова-педагагічных работнікаў мы адстаем ад большасці ВНУ і займаем толькі 9-е месца. Не апублікавана ніводнай манаграфіі выкладчыкамі фізічнага, геалагічнага, матэматычнага, біялагічнага факультэтаў, факультэта фізвыхавання, кафедр грамадскіх навук (акрамя кафедры палітэканоміі).

Па колькасці выдадзеных падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў з грыфам міністэрства — ГДУ на 11 месцы, а па колькасці апублікаваных навуковых артыкулаў у савецкіх і зарубежных часопісах у разліку на 100 чалавек навуковых і навукова-педагагічных работнікаў — на 10. Са 139 апублікаваных у часопісах артыкулаў 57 напісана выкладчыкамі фізічнага факультэта, 16 — эканамічнага, 13 — матэматычнага, 12 — геалагічнага, 7 — біялагічнага факультэтаў, хаця біёлагі ўдзельнічаюць у распрацоўцы трох рэспубліканскіх праграм. Вельмі мала публікацый вучоных нашага універсітэта ў часопісах «Известия вузов» і «Научные доклады высшей школы».

Адносны эканамічны эфект на рубель затрат ва універсітэце склаў 0,89, што значна ніжэй сярэдняга па міністэрству (2) і БДУ (1,84). Самы нізкі гэты паказчык на геалагічным (0,31) факультэце, значна ніжэй магчымага — на фізфаку (0,73), у той час як на эканамічным — 1,4, матэматычным — 1,2.

Па колькасці станоўчых рашэнняў на выдачу аўтарскіх пасведчанняў ГДУ займае 9 месца. Наша надзея і апора ў гэтым пытанні — фізічны факультэт і праблемная навукова-даследчая лабараторыя.

Нізкі ўзровень эфектыўнасці навуковай работы ў многім абумоўлен недастатковай перадпланавай патэнтна-інфармацыйнай прапрацоўкай НДР, адсутнасцю ў некаторых выпадках разлікаў чакаемага эканамічнага эфекта, недастатковай прапагандай нашых распрацовак і вынаходніцтваў, слабай сувяззю з галіновымі міністэрствамі, зацікаўленымі ў нашых распрацоўках, нізкім узроўнем выканаўчай дысцыпліны на факультэтах і кафедрах, слабым кантролем за выкананнем рашэнняў рэктарата, з боку кіраўнікоў структурных падраздзяленняў і загадчыкаў кафедр.

Ухіленню названых недахопаў у навуковай дзейнасці універсітэта, павышэнню ўзроўню і эфектыўнасці НДР будзе садзейнічаць «Мэтавая праграма па павышэнню эфектыўнасці навукова-даследчай работы ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце», адобраная Саветам ГДУ 24 студзеня 1983 года. Кожны факультэт, кожная кафедра павінны паставіць перад сабой бліжэйшыя мэты і распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы, накіраваныя на іх дасягненне, каб універсітэт па эфектыўнасці НДР дасягнуў больш высокіх паказчыкаў.

**С. ПАШУК,**
**нам. загадчыка НДС ГДУ.**



*У НАРОДНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ*

# ЧАРОЎНЫ СВЕТ ПАЭЗІІ

У кожнага з нас ёсць любімы паэт, томік вершаў якога мы з трапяткім адчуваннем адкрываем у вольную хвіліну, каб яшчэ раз пабыць у палоне выдатных вершаваных радкоў, адчуць сугучнасць дум паэта са сваімі, асабістымі. Не ўяўляюць свайго жыцця без паэзіі і многія студэнты нашага універсітэта. Любоў да гэтага літаратурнага жанру прывялі іх у народны універсітэт маральна-эстэтычнага выхавання, які створан у ГДУ. Актыўнымі яго слухачамі сталі і страсныя аматары паэзіі студэнткі матэматычнага факультэта Вікторыя Ермакова, Алена Федасеенка, Алена Корабава, Алена Мухіна. Яны прымаюць актыўны ўдзел у арганізоўваемых на матфаку ў рамках заняткаў народнага універсітэта літаратурных вечарах, прысвечаных творчасці вядомых беларускіх і рускіх савецкіх паэтаў. Падрыхтаваныя з дапамогай супрацоўнікаў кафедры матаналізу, кіраўнікоў народнага універсітэта на матфаку Г. І. Міцкевіч, Я. У. Аксюцік, работнікаў універсітэцкай бібліятэкі, паэтычныя вечары праводзіліся не толькі на факультэце. Дзяўчаты так пранікнёна, з сапраўдным артыстызмам чыталі вершы, што хутка іх выступленні былі ацэнены не толькі на сваім факультэце, а і ва універсітэце наогул. Іх сталі запрашаць выступіць студэнты іншых факультэтаў. А апошняе запрашэнне яны атрымалі з дарожна-будаўнічага тэхнікума, дзе праходзіла нядаўна гарадская нарада бібліятэкараў.

...У зале гучыць музыка С. Рахманінава. Дапытліва і некалькі трывожна глядзіць з партрэта М. Цвятаева. Мы чуем словы: «Яна была паэтам, толькі паэтам, цалкам паэтам, паэтам з ног да галавы». Так пачынаецца літаратурная кампазіцыя «Душа, якая не ведае меры», прысвечаная творчасці М. Цвятаевай, выдатнаму майстру рускага верша, вялікай рускай савецкай паэтэсе.




Цяжкі жыццёвы шлях М. Цвятаевай. Неўтаймавальны яе нораў. Нястомная натура. Глыбокія па зместу, наватарскія па гучанню яе вершы доўгі час заставаліся непрызнанымі. Але ўсё ж «настала чарга» яе вершам. Цвятаеву ведаюць напамяць. Томік яе вершаў набыць вельмі цяжка.

Чытаць вершы М. Цвятаевай са сцэны дадзена не кожнаму, бо яны не льюцца, а рвуцца— рвуцца з жаночага сэрца. Чытальнік павінен данесці да кожнага слухача «крык душы», бязмернасць слоў і пачуццяў аўтара, прымусіць яго хвалявацца. Так чыталі вершы паэтэсы Вікторыя Ермакова і Алена Федасеенка, і ў слухачоў на вачах блішчэлі слёзы.

Аб жыцці М. Цвятаевай, цярністым, няроўным, з узлётамі і падзеннямі пранікнёна і хвалююча расказвала вядучая Алена Корабава.

Вершы М. Цвятаевай нараджаліся з музыкі, таму так многа яе і было ўключана ў паэтычную кампазіцыю: гучалі творы Рахманінава, Шапэна, Бізэ, рускія народныя песні. Песні на вершы М. Цвятаевай выконвала Алена Мухіна пад акампанемент гітары, а на верш «Героям 12-га года» яна сама напісала музыку.

Кампазіцыя нікога не пакінула раўнадушным, зрабіла вялікае ўражанне на ўсіх слухачоў. Нягледзячы на занятасць (цяпер ідзе экзаменацыйная сесія), дзяўчаты знаходзяць час, каб зноў і зноў несці людзям паэзію М. Цвятаевай.

Сваімі ўражаннямі аб паэтычнай кампазіцыі дзеляцца некаторыя слухачы.

**Л. САЛЬНІКАВА,** загадчыца аддзела абслугоўвання бібліятэкі ГДУ: М. Цвятаева — паэтэса, не разбалаваная ўвагай чытачоў ні пры жыцці, ні доўгі час пасля смерці. Тым больш прыемна тое разуменне, тое шчырае пачуццё любві да паэтэсы і яе вершаў, якія прагучалі ў выкананні дзяўчат.

**Т. СІМАНАВА,** выкладчыца кафедры рускай літаратуры: Літаратурная кампазіцыя складзена вельмі ўдала. Пакарае ўлюбёнасць аўтараў кампазіцыі ў творчасць паэтэсы і майстэрскае выкананне яе вершаў. Больш бы такіх цікавых мерапрыемстваў!

**В. КУЗУБАВА,** студэнтка 4-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта: Мяне ўразіла, з якой самааддачай чытаюць вершы дзяўчаты. За іх майстэрствам адчуваеш вялікую працу над сабой. Добры густ і ў аўтара сцэнарыя кампазіцыі. Мы вельмі, вельмі ўдзячны за такую цудоўную сустрэчу са светам паэзіі.

**Н. КАПШАЙ,**
**супрацоўніца бібліятэкі ГДУ.**

**НА ЗДЫМКУ:** выканаўцы паэтычнай кампазіцыі на вершы М. Цвятаевай выступаюць у дарожна-будаўнічым тэхнікуме.

